ПРОЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 284 (1251) | АЎТОРАК, 9-га сьнежня 1930 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:
1 месяц . . . 30 кап.
3 месяцы . . . 90 „
6 месяцаў . . . 1 р. 80 „
1 год . . . 3 р. 30 „
АДРАС РЭДАКЦЫІ:
Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ:
Комсамольская 25, тэлеф. № 903.
ГОД ВЫДАНЬНЯ X.

Кошт асобнага №—2 кап.

Атрад чырвоных захапіў праход праз вялікую кітайскую сьцяну

ПЭЙПІН, 6. Па паведамленьню газэты „Дагун-Бао“, паўстанцкім атрадам пры ўезьдзе ў Чынань удалося захапіць у свае рукі Губэйкаўскі праход кітайскай вялікай сьцяны (на паўночны ўсход ад Пэйпіну).

Рэформістыя здрадзілі гарнякам

ПАРЫЖ. Французскія рэформістыя ізноў здрадзілі гарнякам, склаўшы згоду з прадпрыемцамі аб прадстаўленьні гарнякам водпуску на 3-5 дзён, замест 15, як таго патрабавалі гарняцкія масы.

ПРЫГАВОР ПА СПРАВЕ КОНТРРЭВОЛЮЦЫЙНАЙ ОРГАНІЗАЦЫІ „ПРАМПАРТЫІ“

Спэцыяльная судовая прысутнасьць Вярхоўнага Суду СССР у складзе старшыні тав. Вышынскага, членаў т. Антована—Саратаўскага і Львова, пры ўдзеле ў якасьці абвінаваўцаў—пракурора РСФСР—тав. Крыленка і памоцніка пракурора РСФС тав. Фрыдберга і членаў Маскоўскай абласной колегіі абаронцаў Браўдэ і Оцэпа, разгледзеўшы ў адкрытых і закрытым судовых пасяджаньнях ад 25-га лістапада да 7-га сьнежня 1930 году справу контр-рэволюцыйнай арганізацыі „Саюзу інжынэрных арганізацый“ („Прампартыя“) па абвінавачваньню:

1. Рамзіна,—43 год, грамадзяніна СССР, былога профэсара Маскоўскага Вышэйшага Мэханічнага машына-будаўнічага вучылішча і былога дырэктара Цяплотэхнічнага Інстытуту;

2. Калінькікава—56 год, грамадзяніна СССР, былога намесьніка старшыні вытворчага сэктару Дзяржпляну СССР, былога профэсара Ваенна-паветранай Акадэміі і іншых вышэйшых навучальных установаў;

3. Ларычава—43 год, грамадзяніна СССР, былога старшыні сэкцыі апалу члена прэзыдыуму Дзяржпляну СССР;

4. Чарноўскага—62 год, грамадзяніна СССР, былога намесьніка старшыні навукова-тэхвінага савету машынабудаўніцтва пры кіраўніцтве аб'яднаньня ВСНГ СССР і былога профэсара розных вышэйшых навучальных устаноў;

5. Фядотава,—66 год, грамадзяніна СССР, былога старшыні колегіі Навукова-Дасьледчага тэкстыльнага інстытуту і былога профэсара вышэйшых тэхнічных навучальных устаноў;

6. Купрыянава,—59 год, грамадзяніна СССР, былога тэхнічнага дырэктара оргтэкстылю ВСНГ СССР,—усіх шкоднікаў, у злачынствах, прадугледжаных артыкуламі 58—3, 58—4, і 58—6 крымінальнага кодэксу РСФСР;

7. Очкіна—39 год, грамадзяніна СССР, былога навуковага сэкратара Цяплотэхнічнага Інстытуту і былога загадчыка аддзелам кіраўніцтва навукова-дасьледчага сэктару ВСНГ СССР, у злачынствах прадугледжаных артыкуламі 58—3, 58—6 крымінальнага кодэксу РСФСР, і

8. Сітніна—52 год, грамадзяніна СССР—былога інжынэра Усесаюзнага тэкстыльнага сындыкату, у злачынствах, прадугледжаных артыкуламі 58—3, 58—4 крымінальнага кодэксу РСФСР, устанавіла:

1. Рамзін, уступіўшы ў першай палове 1927 г ду ў конт-рэволюцыйную арганізацыю „Савецкіх інжынэрных арганізацый“, альбо „Інжынэрны Цэнтр“, прыняў актыўны ўдзел у арганізацыі партыі пад імем „Прампартыі“, пры чым пасьля арышту кіраўнікоў гэтай арганізацыі—Пальчынскага і Хрэньнікава—устаў на чале ЦК гэтай партыі, чыннасьць якое была накіравана на простае зьвяржэньне савецкай улады шляхам ваеннай інтэрвэнцыі і аднаўленьня ў СССР капіталістычнага ладу. У гэтых мэтах, а таксама ў мэтах непасрэднай падрыхтоўкі інтэрвэнцыі, Рамзін: а) уступіў у зносіны ад імя „Прампартыі“ з бела-эмігранцкім цэнтрам былых уласьнікаў, які знаходзіцца ў Парыжы (Гандальпромам); б) уступіў у сувязь з інтэрвэнцыяністкімі коламі Францыі, устанавіўшы з імі сталую сувязь праз асоб французскае службы ў Маскве—грамадзян К. і Р.: в) устанавіў сыстэматычнае фінансаваньне „Прампартыі“ з боку Гандальпрому і паказаных вышэй колаў; г) прыняў удзел у распрацоўцы конкрэтнага пляну падрыхтоўкі сумесна з паказанымі вышэй коламі і Гандальпромам, інтэрвэнцыі супроць СССР і даў ад імя ЦК „Прампартыі“ згоду на выплату царскіх даўгоў, і адтаржэньня ад СССР значнай тэрыторыі; д) арганізаваў і кіраваў у тых-жа мэтах сыстэматычным шкодніцтвам у розных галінах народнай гаспадаркі СССР; е) арганізаваў падрыхтоўку дывэрсыйных актаў, дзеля чаго арганізаваў адпаведныя дывэрсыйныя групы, асабіста распрацаваўшы, апрача гэтага, плян дывэрсыйнай чыннасьці ў галіне энэргетыкі; ж) маючы рэгулярныя зносіны з асобамі французскае службы грамадзянамі К. і Р., паведамляў ім і праз іх весткі, у вуснай і пісьмовай форме, шпіёнскага характару; з) арганізаваў і ажыцьцяўляў разьмеркаваньне грашовых сродкаў, якія паступалі з-за граніцы, на мэты злачыннай дзейнасьці „Прампартыі“, г. зн. рабіў злачынствы, прадугледжаныя артыкуламі 58-3, 58-4, 58-6 і 58-11 кр. код. РСФСР.

2. Калінькікаў—уступіўшы ў тыя-ж арганізацыі ў якасьці члена ЦК „Прампартыі“, кіраваў шкодніцкай, дывэрсыйнай і шпіёнскай чыннасьцю „прампартыі“, накіраванай на зьвяржэньне савецкае ўлады шляхам ваеннай інтэрвэнцыі і да аднаўленьня капіталістычнага ладу. Апрача таго: а) займаючы пасаду намесьніка старшыні прамсэкцыі Дзяржпляну, скарыстаў сваё службовае становішча ў мэтах складаньня папярэдніх плянаў для зрыву пяцігодкі; б) прапанаваў, разам з Чарноўскім, ЦК „Прампартыі“ ажыцьцявіць дывэрсыйны плян у галіне мэталюргічнай прамысловасьці, што і было ЦК „Прампартыі“ прынята; в) уступіўшы ў сувязь з асобамі французскае службы ў Маскве; К. і Р., падрыхтоўваў і перадаваў праз іх за-граніцу весткі шпіёнскага характару; г) разьмяркоўваў грашовыя сродкі, якія паступалі з-за граніцы, паміж асобамі ЦК падначаленай яму галіннай цэпкі, г. зн. рабіў злачынствы, прадугледжаныя артыкуламі 58-5, 58-4, 58-6 і 58-11 крымінальнага кодэксу РСФСР.

3. Ларычаў—уступіўшы ў арганізацыю „Інжынэрнага Цэнтру“ ў 1926 г., прымаў удзел у арганізацыі „Прампартыі“. Будучы членам „Прампартыі“, кіраваў дывэрсійнай, шпіёнскай і шкодніцкай чыннасьцю, накіраванай на паказаныя вышэй мэты. Апрача таго: а) уступіў у непасрэдныя зносіны ад імя „Прампартыі“ з Гандальпромам і інтэрвэнцыянісцкімі коламі ў Парыжы; б) увайшоў у сувязь з асобамі французскае службы ў Маскве К. і Р. у паказаных вышэй мэтах; в) разьмяркоўваў паміж членамі падначаленай яму шкодніцкай організацыі грашовыя сумы, якія дасылаліся з-за граніцы; г) будучы старшынёю сэкцыі апалу Дзяржпляну, непасрэдна кіраваў, скарыстоўваючы ў контр-рэволюцыйных мэтах сваё службовае становішча, шкодніцтвам у галіне пляваваньня прамысловасьцю па апалу, у прыватнасьці нафтавай, а таксама прыняў удзел у кіраўніцтве шкодніцкай работаю на транспарце; д) ажыцьцяўляў шпіёнскую работу шляхам перадачы адпаведных матар'ялаў за граніцу праз паказаных вышэй асоб французскае службы ў Маскве, г. зн. рабіў злачынствы, прадугледжаныя артыкуламі:—58-3, 58-4, 58-6 і 58-11 кр. код. РСФСР;

4. Чарноўскі—уступіўшы ў 1927 г. ў тыя-ж контр-рэволюцыйныя організацыі і прымаючы актыўны ўдзел у кіраўніцтве работай контр-рэволюцыйнай організацыі „Прампартыі“ у якасьці члена яе ЦК, ажыцьцяўляў шкодніцкую, дывэрсыйную і шпіёнскую чыннасьць у тых-жа мэтах. Апрача таго: а) кіраваў шкодніцтвам у галіне мэталюргічнай прамысловасьці; б) кіраваў шкодніцкай работай пры праходжаньні проэктаў праз навукова-тэхнічны савет, дзякуючы чаму была затрымана пабудова шэрагу заводаў, у тым ліку па танкабудаўніцтву, была створана дыспропорцыя ў цэхах, былі ажыцьцёўлены нерацыянальныя ўкладаньні капіталу і ў цэлым было затрымана разьвіцьцё мэталюргічнай прамысловасьці; в) распрацаваў, сумесна з Калінькікавым, дывэрсыйны плян у галіне абслугоўваньня заводамі ваенных патрэб; г) разьмяркоўваў паміж членамі шкодніцкай організацыі грашовыя сродкі, якія дасылаліся з-за граніцы; д) складаў, разам з Калінькікавым, для перадачы за граніцу сводкі шпіёнскага характару, г. зн. рабіў злачынствы, прадугледжаныя артыкуламі 58-3, 58-4, 58-6 і 58-11 кр. код. РСФСР;

5. Фядотаў—у 1925 годзе ўступіў у тэкстыльную шкодніцкую групу, якою потым і кіраваў. Уступіў у „Прампартыю“, увайшоўшы ў яе ЦК, і ажыцьцяўляў кіраўніцтва дывэрсыйнай, шкодніцкай і шпіёнскай чыннасьцю „Прампартыі“. Апрача таго: а) кіраваў непасрэдна шкодніцкай чыннасьцю галіннай організацыі тэкстыльнай прамысловасьці, ажыцьцяўляючы гэта шкодніцтва як у рабоце па складаньню пяцігадовага пляну, так і шляхам штучнага запавольваньня тэмпаў разгортваньня вытворчасьці і новага будаўніцтва, ствараючы затрудненьні па забясьпечаньню гэтай прамысловасьці сыравінаю і імпортным абсталяваньнем, найбольш тэхнічна высокае якасьці і падрываючы разьвіцьцё ўсіх вытворчасьцяй, у якіх савецкая дзяржава пачула-б асаблівую патрэбу на выпадак ваенных падзей; б) разьмяркоўваў грашовыя сродкі з шкодніцкімі мэтамі, якія дасылаліся з паказаных вышэй крыніц г. зн. рабіў злачынствы, прадугледжаныя артыкуламі 58-3, 58-4, 58-6 і 58-11 кр. код. РСФСР;

6. Купрыянаў — будучы членам „Прампартыі“, у тых-жа мэтах: а) падтрымліваў зносіны з прадстаўнікамі Гандальпрому ў мэтах ажыцьцяўленьня шкодніцкай і інтэрвэнцыянісцкай работы „Прампартыі“; б) праводзіў у жыцьцё дырэктывы „ЦК „Прампартыі“ па складаньню шкодніцкіх плянаў у тэкстыльнай прамысловасьці, па выпрацоўцы асортымэнту тавараў, якія не адпавядалі патрабаваньням рынку, па затрыманьню тэкстыльнага машына-будаўніцтва; в) несвоечасоваму і няправільнаму завозу тэкстыльных тавараў па раёнах; г) разьмяркоўваў грошы паміж членамі тэкстыльнай, шкодніцкай групы; д) прыняў даручэньне ЦК „Прампартыі“ організаваць ваенную групу з былых белых афіцэраў; е) прыняў даручэньне ЦК „Прампартыі“ па здабываньню сакрэтных вестак па мобрабоце тэкстыльнай прамысловасьці, г. зн. рабіў злачынствы, прадугледжаныя артыкуламі 58-3, 58,4, 58-6 і 58-11 крым код. РСФСР;

7. Ачкін—будучы членам „Прампартыі“ выконваў даручэньні ЦК „Прампартыі“ ў асобе Рамзіна па сувязі з асобамі французскае службы ў Маскве К. і Р. Апрача таго ўваходзіў у дывэрсыйную групу Цяплотэхнічнага інстытуту, г. зн. зрабіў злачынствы, прадугледжаныя артыкуламі 58-3, 58-6, 58-11 крым. код, РСФСР

8. Сітнін—будучы членам „Прампартыі“, загадзя ведаючы аб пастаўленых ёю мэтах, прымаў на сябе выкананьне адпаведных заданьняў у галіне шкодніцкай работы і апрача таго, уступіўшы ў зносіны з прадстаўнікамі Гандальпрому, інформаваў апошніх аб дзейнасьці „Прампартыі“ і перадаваў ад іх дырэктывы апошняй, г. зн. рабіў злачынствы, прадугледжаныя артыкуламі 58-3, 58-4 58-11 крым. код. РСФСР.

Спэцыяльная прысутнасьць Вярхоўнага Суда СССР прыгаварыла:

1. Купрыянава да 10 год пазбаўленьня волі, з паражэньнем у правох тэрмінам на 5 год, з конфіскацыяй усяе маемасьці, 2. Сітніна да 10 год пазбаўленьня волі, з паражэньнем у правох тэрмінам на 5 год і конфіскацыяй усяе маемасьці, 3. Очкіна да 10 год пазбаўленьня волі, з паражэньнем у правох тэрмінам на 5 год і конфіскацыяй усяе маемасьці. 4. Калінькікава да вышэйшай меры сацыяльнай абароны—растрэлу, з конфіскацыяй усяе маемасьці; 5. Чарноўскага да вышэйшай меры сацыяльнай абароны—растрэлу, з конфіскацыяй усяе маемасьці; 6. Ларычава да вышэйшай меры сацыяльнай абароны—растрэлу, з конфіскацыяй усяе маёмасьці; 7. Фядотава да вышэйшай меры сацыяльнай абароны—растрэлу, з конфіскацыяй усяе маемасьці; 8. Рамзіна да вышэйшай меры сацыяльнай абароны—растрэлу з конфіскацыяй усяе маемасьці.

Усім прыгавораным к тэрміноваму пазбаўленьню волі залічыць тэрміны іх папярэдняга зьняволеньня;

Прысуд канчатковы і абскарджаньню не падлягае.

Пастанова Прэзыдыуму ЦВК СССР

Заслухаўшы паступіўшыя 8-га гэтага сьнежня хадайніцтвы аб памілаваньні прысуджаных спэцыяльным прысутнічаньнем Вярхоўнага Суду Саюзу ССР па справе контррэволюцыйнай організацыі, так званай „Прампартыі“, да вышэйшай меры сацыяльнай абароны—растрэлу Рамзіна, Чарноўскага, Калінькікава, Ларычава і Фядотава і прысуджаных да 10-ці гадовага пазбаўленьня волі Очкіна, Сітніна і Купрыянава, і прыняўшы пад увагу:

1) што асуджаныя ня толькі прызналіся і раскаяліся ў зробленых імі злачынствах, але сваімі паказаньнямі на папярэднім і судовым сьледзтвам разброілі сваю контр-рэвалюцыйную організацыю, якая зьяўляецца агэнтурай і выканаўцай дырэктыў інтэрвэнцыянісцкіх і ваенных колаў кіруючай буржуазеі Францыі і іх прыдатку ў выглядзе „Гандальпрому“—аб'яднаньня былых буйных расейскіх капіталістых у Парыжы;

2) што Савецкая ўлада ня можа кіравацца наогул пачуцьцём помсты, у асаблівасьці ў адносінах да абязшкоджаных злачынцаў, якія прызналіся і раскаяліся

Прэзыдыум ЦВК СССР пастанаўляе:

1) Замяніць асуджаным да вышэйшай меры сацыяльнай абароны—растрэлу Рамзіну, Чарноўскаму, Калінькікаву, Ларычаву, Фядотаву растрэл—пазбаўленьнем волі на 10 год з паражэньнем у правох тэрмінам на 5 год і з застаўленьнем прыгавору Вярхоўнага Суду ў адносінах канфіскацыі маемасьці.

2) Замяніць асуджаным Очкіну, Сітніну і Купрыянаву адзначаную да іх Вярхоўным Судом меру сацыяльнай абароны—10-цігадовае пазбаўленьне волі—пазбаўленьнем волі на 8 год, пакінуўшы ў моцы ўсе астатнія вызначаныя прыгаворам Вярхоўнага Суду вынікі—конфіскацыя маемасьці і паражэньне ў правох.

Ворагі пролетарскай дыктатуры—Ластоўскі, Пічэта, Лёсік, Некрашэвіч, Гарэцкі і Дубах—пазбаўлены годнасьці акадэмікаў

Пастанова Савету Народных Камісараў Беларускай Савецкай Социялістычнай Рэспублікі

У сувязі з выяўленай шкоднай, контррэволюцыйнай дзейнасьцю групы акадэмікаў Беларускай Акадэміі Навук, дзейнасьцю, накіраванай супроць дыктатуры пролетарыяту і на зрыў пасьпяховага соцыялістычнага будаўніцтва, Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе: выключыць са складу Беларускай Акадэміі Навук акадэмікаў Ластоўскага Вацлава Юстынавіча, Пічэту Уладзімера Іванавіча, Лёсіка, Язэпа Юркавіча, Некрашэвіча Сьцяпана Міхайлавіча, Гарэцкага Гаўрылу Іванавіча і Дубаха Аляксандра Давідавіча, пазбавіўшы іх годнасьці акадэмікаў, як ворагаў пролетарскай дыктатуры.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР **М. Галадзед**

Кіраўнік спраў СНК і Экономічнай Нарады БССР **М. Калевіч**

6 сьнежня 1930 г. Менск.

„Газэта Польска“ заклікае да экономічнай блёкады супроць СССР

„Апошні сродак барацьбы супроць СССР—экономічны байкот“

ВАРШАВА, 6. „Газэта Польска“ пачала сэрыю артыкулаў, прысьвечаных СССР. У першым артыкуле, у якім гаворыцца аб савецкай уладзе, чытаем:

„Мы маем справу бязумоўна з таленавітымі людзьмі, уладаючымі настарожанай чуласьцю і солідарнасьцю, якія дазваляюць ім адкідваць усе ўнутраныя супярэчнасьці перад тварам небясьпекі. Неабходна, каб мы гэта зразумелі. Недаацэнка праціўніка можа трагічна скончыцца для тых, хто па географічных прычынах можа стаць першай ахвярай чырвонага сфінкса. Пагэтаму,—піша „Газэта Польска“—нас занепакоіў факт, што польскі друк дазволіў ашукаць сябе ўсялякімі паведамленьнямі аб пераваропе ў Маскве“.

У другім артыкуле думкі аўтара ўжо крышталізуюцца даволі выразна. „Спадзявацца на ўнутраны пераварот нечага. Аб гэтым гавораць хаця-б паводзіны абвінавачваных у процэсе „прампартыі“. Якія-ж пэрспэктывы? Пяцігадовы плян наперакор усім крыкам можа быць рэалізаваны. Улада, якая ўладае 200 млн. рэзэрвам людзей, мае ў руках нязьлічэныя магчымасьці. Замежныя крэдыты, нарэшце, у зьвязку з сусьветным прамысловым крызісам, могуць быць Масквой атрыманы ў яшчэ большых разьмерах. Масква мае шмат часу і можа чакаць. Яна ўмее іграць на эўропэйскіх супярэчнасьцях. Адсюль вывад, што солідарны экономічны бойкот СССР быў-бы страшней, чым усякія інтэрвэнцыі“

Нажаль, эўропэйскія спэкулянты ня лічацца з гэтым момантам і гатовы дзеля прыбытку ісьці на ўсё. Вось якія галоўнейшыя думкі польскага афіцыёзу. І так: „ня трэба разьлічваць на ўнутраны пераварот, трэба організаваць экономічны бойкот“, а інтэрвэнцыя... прыдзе сама.

Тысячы рабочых выкінуты на вуліцу

ЛЁНДАН. У Ангельшчыне зачыніліся тры суднабудаўнічыя вэрфы, на якіх працавала некалькі тысяч рабочых.

Фірма Клярк заявіла, што яе суднабудаўнічая вэрфа ў Бэльфасьце, якая зьяўляецца аднэй з буйнейшых у Ангельшчыне, часова зачыняецца з прычыны экономічнага крызісу.

БЫЦЬ ОРГАНІЗАТАРАМІ КОЛГАСНАГА ПРЫБОЮ

Організуючы масавую работу з беднатой і батрацтвам, шырока папулярызуючы гаспадарчыя дасягненьні колгасу—мы заоясьпеч[ым] магутны ўздым новага колгаснага руху і, на базе суцэльнай колектывізацыі, будзем упарта ажыцьцяўляць політыку ліквідацыі кулацтва як клясы

ЛКСМБ ПАВІНЕН ЛІКВІДАВАЦЬ ПРАРЫЎ У СВАЕЙ РАБОЦЕ ПА ДАПАМОЗЕ ПАРТЫІ Ў ОРГА-НІЗАЦЫІ РАБОТЫ З БАТРАЦТВАМ І БЕДНАТОЙ

Аб становішчы работы сярод беднаты і далейшых задачах

(З пастановы ЦК КП(б)Б)

1. У сувязі з дася нутымі посьпехамі партыі ў справе колектывізацыі сельскай гаспадаркі. соцыяльная база савецкай улады ў вёсцы ўмацавалася і пашырылася. Шырокае разгортваньне колгаснага руху стварыла новую апору савецкай улады ў вёсцы ў асобе колгасьніка.

Гэта, аднак, ні ў якім выпадку не азначае адмаўленьня партыі ад работы з вясковай беднатой, асабліва на дасягнутым у БССР узроўні колектывізацыі, калі пераважная большасьць сялянскіх гаспадарак усё яшчэ застаецца адзінаасобнымі гаспадаркамі. Гутаркі аб адмаўленьні партыі ад работы з беднатой і ад апоры на беднату—ёсьць гутаркі яўна опортуністычныя і патрабуюць рашучага асуджэньня. Недаацэнка і пасыўнасьць у рабоце па організацыі беднаты і батрацтва зьяўляецца адной з самых горшых праяў правага ўхілу на практыцы.

2. ЦК КП(б)Б адзначае, што. ня гледзячы на рад дырэктыў кіруючых органаў партыі аб разгортваньні работы з батрацтвам і беднатой, фактычнае становішча работы ў раёнах сьведчыць аб невыкананьні нізавымі партыйнымі організацыямі і радам цэнтральных устан ў дырэктыў партыі аб разгортваньні работы з батрацтвам і беднатой:

а) Важнейшыя гаспадарча-політычныя кампаніі ў вёсцы (сяўба, загатоўкі) праходзяць без выстарчальнага разгортваньня з боку партыйных організацый работы сярод батрацтва і беднаты. Прычынай недахопаў у правядзеньні кампаній у значнай меры зьяўляецца слабасьць работы з беднатой.

б) Ня гледзячы на простыя паказаньні ЦК, групы беднаты не арганізаваны пры адпаведных колгасах і ўсіх сельска-гаспадарчых таварыствах, а там, дзе групы арганізацыйна аформлены, не разгарнулі належнай практычнай дзейсьці.

в) Якасны падбор кіраўнікоў груп беднаты ў асноўнай масе нездавальняючы, акрамя таго, райкомы КП(б)Б не забясьпечылі выстарчальнага кіраўніцтва імі.

г) Маецца яўнае аслабленьне ў радзе месц матар'яльнай і культурнай дапамогі беднаце. Фонды, асыгнаваныя для коопэраваньня батрацтва і беднаты, у большасьці коопэрацыйных організацый выкарыстоўваюцца зусім нездавальняюча.

„Партыйныя організацыі ў колгасах павінны забясьпечыць такую пастаноўку работы груп беднаты, каб яны ня толькі абаранялі непасрэдныя інтарэсы беднаты, але і садзейнічалі ўмацаваньню саюзу рабочае клясы і вясковай беднаты з серадняк[а]мі" (з пастановы 16 зьезду УсеКП(б)Б.

4. У мэтах максымальнага ўзмацненьня работы сярод беднаты, ЦК КП(б)Б прапануе райкомам:

а) Організаваць групы беднаты пры ўсіх сельска-гаспадарчых таварыствах, коопэрацыйных і савецкіх організацыях. Ва ўсіх колгасах павінна быць пастаўлена работа з беднатой. Аднак, не ва ўсіх колгасах неабходна ствараць групы беднаты. У тых колгасах, дзе пасьпяхова выжываюцца спажывецкія настроі, існуюць сьвядомыя адносіны да выкананьня сваіх абавязкаў перад дзяржавай, гаспадарчае ўмацаваньне колгасу шляхам інтэнсыфікацыі і пашырэньня гаспадаркі, правільная лінія ў пытаньнях абагульненьня, наяўнасьць працоўнай дысцыпліны і правільная організацыя працы—ствараюць упэўненасьць у сапраўднай моцнасьці данага колгасу,—групы беднаты не павінны ствараца. Наадварот групы беднаты павінны ствараца па пастанове РК КП(б)Б ва ўсіх тых выпадках, дзе наяўнасьць цэрцый у асяродзішчы колгасьнікаў, організацыйныя недахопы, індывідуалістычныя або спажывецкія імкненьні ствараюць умовы, пры якіх пасьпяховае разьвіцьцё колгасу ўскладняецца.

Што датычыць колгасаў, якія нанова організуюцца, дык у першы пэрыод іх існаваньня неабходна організоўваць групы беднаты з ліку батракоў і беднякоў, абраных у члены праўленьня і рэв. камісіі колгасу.

Асноўнай умовай пры правядзеньні работы з беднатой у колгасах павінна зьявіцца ня толькі недапушчэньне—якіх бы там ні было разладаў паміж колгасьнікамі, беднякамі і серадняками, а наадварот — устанаўленьне шчыльнага саюзу з серадняком, накіраванага на ўзмацненьне колгасу і абавязковае прыцягненьне серадняка да кіраўніцтва гаспадарчым жыцьцём колгасу.

б) Дзейнасьць груп беднаты ў колгасах неабходна падпарадкаваць таму, каб колгасы найбольш пасьпяхова спраўляліся з гаспадарча-політычнымі задачамі, што на іх ускладаюцца. Стрыжнёвымі пытаньнямі работы груп беднаты павінны зьявіцца вытворчыя пытаньні жыцьця колгасу: Асеньняя сяўба, правільная організацыя працы, разьмеркаваньне ўраджаю, вырашэньне задач жывёлагадоўлі, сваечасовае выкананьне пляну збожжазагатовак выкананьне кантрактацыйных дагавароў, барацьба з спажывецкімі настроямі з безгаспадарчасьцю ў колгасе—вакол гэтых важнейшых пытаньняў і неабходна будаваць работу груп беднаты ў колгасах. Група беднаты павінна зьяўляцца асноўным дапаможнікам праўленьня і парт'ячэйкі ў вырашэньні гэтых задач.

в) У далейшай дзейнасьці райкомаў увесьці ў сыстэму скліканьне нарад кіраўнікоў груп беднаты, наладзіўшы сыстэматычнае кіраўніцтва і інструктаж кіраўнікоў груп беднаты, а таксама рэгулярную справаздачнасьць кіраўнікоў нарад парт'ячэйкамі,

г) Пры правядзеньні гаспадарча-політычных кампаній неабходна організоўваць работу так, каб максымальна актывізаваць удзел батрацтва і беднаты ў гэтых кампаніях. Папярэднія нарады, сходы і конфэрэнцыі беднаты з конкрэтным абгаварэньнем пытаньняў практычнага ўдзелу беднаты ў правядзеньні кампаній,—зьяўляюцца элемэнтарнай формай работы і павінны шырока практыкавацца партыйнымі організацыямі,

д) У працягу месячнага тэрміну праверыць выдаткаваньне фондаў беднаты і батрацтва. што вылучаны па лініі коопэрацыі, КСУ і інш. організацый, прыняўшы сапраўдныя меры да поўнага скарыстаньня фондаў па прызначэньню. Аб выніках праверкі далажыць ЦК,

е) Прыняць рашучыя меры па прыцягненьню ў работу батрацка-бядняцкіх груп і ва ўсю работу сярод беднаты жанчын-батрачак і бядначак.

Устанавіць пэрсональную адказнасьць кіраўнікоў груп беднаты за прыцягненьне да работы батрацка-бядняцкіх груп батрачак і бядначак.

5 У сувязі з тым, што найбольш слаба пастаўлена работа груп беднаты ў колгасах і сельска-гаспадарчых таварыствах, ЦК КП(б)Б прапануе на працягу бліжэйшага часу правесьці праверку стану работы груп беднаты і работы сярод беднаты наогул у гэтых організацыях. Праверку правесьці з мэтай максымальнага ўзмацненьня работы сярод беднаты у колгасах і с-г. таварыствах і ўстанаўленьня сапраўднага кіраўніцтва з боку кожнай партыйнай ячэйкі гэтай работай.

7. ЦК КП(б)Б адзначае, што асабліва слаба пастаўлена работа сярод беднаты ў сыстэме саматужна-прамысловай коопэрацыі. Групы беднаты ў большасьці саматужна - прамысловых арцеляй не організаваны. Прапанаваць фракцыі Белсамапрамсаюзу разгарнуць работу сярод беднаты мобілізаваўшы яе ўвагу на разгортваньне соцспаборніцтва ў рабоце сампрамкоопэрацыі, на ачыстку арцеляй ад кулацка-нэпманскіх элемэнтаў.

Пры правядзеньні работы сярод беднаты райкомы павінны больш увагі аддаваць пастаноўцы гэтай работы ў прамкоопэрацыі.

8. ЦК КП(б)Б адзначае яўна нездавальняючы ўдзел комсамольскай організацыі ў рабоце партыі сярод беднаты. Прапанаваць ЦК ЛКСМБ прыняць меры да павышэньня актыўнага ўдзелу комсамолу ў рабоце сярод беднаты, асабліва па лініі разгортваньня работы сярод батрацка-бядняцкай моладзі.

10. Лічыць неабходным склікаць пры ЦК КП(б)Б нараду па пытаньнях работы сярод батрацтва і беднаты.

„Новая Зара"—кандыдат на прэмі[ю]

Коханава 5. (ад наш. сьпэцкора). С.-г. арцель **Новая Зара"** Палюдоўскага с-савету організавалася ў сакавіку 1930 году з 14 гаспадарак: 5 бядняцкіх, 6 серадняцкіх і 3-х гаспадарак батракоў-адзіночак.

Згодна пляну, арцель меркавала засеяць ярыны 56 га., а засеяла 61 га. Уся работа па вясеньняй сяўбе закончылася раней вызначанага тэрміну. Колгас па-бальшавіцку справіўся з уборачнай кампаніяй.

10 верасьня колгас скончыў пасеў азімых, засеяўшы жыта 46 га, замест 40 га. Заданьне па ўзорцы зябі **выканана на ўсе 100 пр.,** узарана 40 га.

Арцель атрымала 14730 руб. агульнага прыбытку. Кожная гаспадарка мае прыбытку ў сярэднім 480 руб.

Пры разглядзе разьмеркаваньня ўраджаю на агульным сходзе, колгасьнікі адзначылі, што прыбытак, які яны атрымалі, **у два разы перавышае іх прыбытак** пры адзіналічным вядзеньні гаспадаркі.

Арцель „Новая Зара" першаю ў раёне **пачала здачу збожжа.**

На 25 лістапада арцель [вы]канала заданьне [на]ступным чынам: **збожжа зам[ест] плянавых 40 цэнтнэраў, зд[ала] 170, што складае 425 проц.** [вы]кананьня. **Бульбы, замест** [...] **цэнтнэраў, здала 300 ц[энтн.]** (120 проц.). **Ільна-насеньня, [за]мест 16 цэнтн., здала 37 ц[энтн.]** (231 проц.). **Ільна-валакна, [за]мест 8 цэнтн.—11 цэнтн.** [(...] **проц.).**

Акрамя гэтага арцель [мяр]куе здаць 250 цэнтн. буль[бы], 35 цэнтн. збожжа і 10 цэ[нтн.] ільнавалакна.

У сучасны момант арцель пр[аво]дзіць справаздачную кампанію [пе]рад адзінаасобнікамі аб выніках [гас]падарчага году.

У выніку справаздачных сх[одаў] і шырокай папулярызацыі [сярод] адзінаасобнікаў гаспадарчага эф[экту] колгасу ў в. в. **Жукнева орг[аніза]ваўся колгас з 12 гасп[ада]рак і ў вёсцы Варанцэвіч[ы] 18 гаспадарак.**

Акрамя гэтага, у арцель [„Но]вая Зара" ўступіла 7 гас[па]дарак.

Колгас здаў увесь сельгаспа[даток] і аформіў падпіску на пазыку [„Пя]цігодка—у чатыры гады".

На ўсіх сходах адназсобнікі [кан]статуюць прыкладную работу [кол]гасу.

Х. Б-[...]



Колгасьнікі колгасу „Новае Лядцо" (Пухав. р.) здаюць хлеб

Масавая самаправерка колгасаў—магутны вагар для ўздыму колгаснага прыліву

Магілеўскі РК КП(б)Б і газэта „Комунар Магілеўшчыны" абвясьцілі марш-пераклічку соцземляробства, але ў яго правядзеньне ўключылася ня больш 4-5 колгасаў. Партыйная і комсамольскія ячэйкі ў сваёй большасьці для гэтай пераклічкі нічога не зрабілі. Райколгассаюз не падхапіў ініцыятыву газэты „Комунар Магілеўшчыны", бо лічыць непатрэбным дапамагчы колгасам па-бальшавіцку разгарнуць масавую самаправерку і справаздачнасьць колгасаў перад аднаасобнікамі.

Масавая самаправерка ў Магілеўскім раёне набывае асаблівае значэньне. Яна павінна была прайсьці пад знакам мобілізацыі ўвагі колгасьнікаў і аднаасобных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак на ўнутранае ўмацаваньне існуючых колгасаў, правільную організацыю працы, правільнае разьмеркаваньне ўраджаю, устанаўленьне правільных узаемаадносін паміж колгасамі і аднаасобнымі гаспадаркамі, мобілізуючы колгасьнікаў на барацьбу з кулацтвам і ліквідацыю яго як клясы на базе суцэльнай колектывізацыі.

А ў раёне якраз зусім не адчуваецца новага ўздыму прыліву ў колгасы, бо ў гэтым напрамку не вядзецца работа. За летня-асеньні пэрыод толькі ў частцы колгасаў быў назначны прыліў 4-5 гаспадарак. У некаторыя колгасы за ўвесь час іх існаваньня ня ўлілося ні аднае гаспадаркі, яны ня маюць тэндэнцыі расьці, не праводзяць працы па ўцягненьню ў колгас бядняцка-серадняцкіх гаспадарак

Колгас „Адраджэньне" існуе з 24 году, ён добра абсталяваны і налічвае ў сябе 8 сямей. Гэты колгас за 6 год свайго існаваньня ня прыняў ніводнай бядняцка-серадняцкай гаспадаркі. Кіраўніцтва колгасу, адбіваючы опортуністычныя настроі, кажа —„Навошта нам новыя колгасьнікі, мы ўжо ўжыліся і нам адным добра. Яны будуць толькі перашкаджаць у нашай працы" і г. д.

Што-ж робіцца ў раёне для таго, каб павесьці рашучую барацьбу з падобнымі тэндэнцыямі? Нічога.

Партыйная і комсамольская ячэйка самі плятуцца ў хвасьце такіх настрояў і пад іх уплывам здаліся на самацёк у колгасным руху.

Над паасобнымі колгасамі шэфствуюць рабочыя організацыі Магілева, як, напр. швэйная фабрыка, чыгунка, завод Сталіна, Валаквабуд і інш., але таксама не дапамагаюць колгасам весьці барацьбу з тэндэнцыямі замкнутасьці, організаваць масавую самаправерку колгасаў.

Гэтыя шэфы ў большасьці выяжджаюць у колгасы толькі на ўрачыстасьці,

Пералічаныя факты з ўсёй настойлівасьцю патрабуюць ад мясцовых партыйна-комсамольскіх ячэек, профсаюзных і іншых грамадзкіх організацый мобілізаваць сваю ўвагу на дапамогу газэце „Комунар Магілеўшчыны" і колгасам організаваць масавую самаправерку колгасаў і мобілізаваць масы колгасьнікаў і бядняцка-серадняцкія аднаасобныя гаспадаркі на барацьбу за організацыю новага магутнага ўздыму колгаснага руху, на барацьбу з кулацтвам і ліквідацыю яго як клясы на базе суцэльнай колектывізацыі.

Пасьпяховае выкананьне лёзунгу нашай партыі--скончыць у асноўным колектывізацыю сельскай гаспадаркі СССР да канца пяцігодкі—вымагае ад партыйных комсамольскіх і іншых організацый упартай работы па організацыі бядняцка-батрацкіх колаў вёскі, разгортваньня шырокай масавай работы па папулярызацыі гаспадарчага эфэкту колгасаў сярод аднаасобных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.

Партыйныя і комсамольскія організацыі Магілеўскага раёну павінны гэта выканаць.

С. Саўрэй.

Рост колгаснага прылі[ву]

Па Недальскім сельсавеце [(...]гомльскі раён) дзякуючы пась[яхо]ваму скончэньню ўборачнай і [па]сеўнай кампаніі, шырокаму пр[авя]дзеньню колгасамі масавай р[аботы] па папулярызацыі сярод адна[асоб]ных бядняцка-серадняцкіх гас[пада]рак гаспадарчага эфэкту колг[асаў] маецца значны прыліў аднаас[обні]каў у колгасы. Па сельсавеце ўс[ту]піла ў колгас 18 чал. і орган[ізава]ны ў дзьвюх вёсках ініцыяты[ўныя] групы.

Я. Бабіцк[і]

— У Кнорынскім сельсавеце, [Пу]хавіцкага раёну, у вёсцы Пар[...] організаваўся колгас з 25 бя[дняц]ка-серадняцкіх гаспадарак, у [...]скім сельсавеце—колгас з 13 [гас]падарак, у колгасы імя 1 [...] „Чырвоны Май" уступіла звыш [...] бядняцка-серадняцкіх гаспадар[ак].

М. [...]

— У выніку разгорнутай [рабо]ты сярод бядняцка-серадняцкіх [...] у Сяргеевіцкім сельсавеце, Пух[ові]кага раёну, організавана два но[выя] колгасы—імя Варашылава—[...] гаспадарак і імя Будзёнага—[...] гаспадарак. Таксама маецца зна[чны] прыліў у старыя колгасы.

Валод[...]

— Колгас Сталіна (Самахв[ала]скі раён) наладзіў шырокую с[права]вздачную работу перад адна[асоб]нымі бядняцка-серадняцкімі гас[па]даркамі. На першым праведз[еным] сходзе ў колгас запісалася 5 [бяд]няцка-серадняцкіх гаспадарак.

Піску[...]

— У вёсцы Коўча, п. іні[цыя]тыве партыйнай і комсамол[ьскай] ячэек, організаваўся колгас [...] гаспадарак. Далейшай упартай [...] цай комсамольскай ячэйкі ў колгас завярбавана яшчэ 34 [бяд]няцка-серадняцкія гаспадаркі.

Ганчаро[...]

У падарунак зьезду

КОХАНАВА, 8. У падар[унак] зьезду беларускага комсамолу [...]бецкай комсамольскай ячэйкай [ар]ганізаваны колгас „Новы Шл[ях]" [з] 9-ці гаспадарак. **БАЦЬВІНЬ[...]**

ПАВЫСІЦЬ ТЭМПЫ БЕЛАРУСІЗАЦЫІ

Шэраг організацый ЛКСМБ нездавальняюча выконваюць мерапрыемствы месячніка

Дырэктывы ЦК УсеЛКСМ і ЦК КП(б)Б у справе павялічэньня ўдзельнай вагі ЛКСМБ у нацыянальна-культурным будаўніцтве Беларусі і асабліва ўзмацненьня беларусізацыі, павінны быць поўнасьцю выкананы

Непахісна ажыцьцяўляць генэральную лінію партыі ў нацыянальным пытаньні, наносіць руйнуючы ўдар па вылазках вялікадзяржаўнага шовінізму,—галоўнай небясьпецы, рашуча біць па нацыянал-дэмократызму і шовінізмах іншых адценьняў

Узмацніць работу па выкананьню рашэньняў ЦК УсеЛКСМ і ЦК КП(б)Б у галіне ўдзелу ў нац. культ. будаўніцтве

Невыпадковы той факт, што асабліва за апошні час мы маем найбольш ярыя атакі супраціўляючыхся рэштак капіталістычных элемэнтаў на лінію партыі і ненавіта на фронце нацыянальна-культурнага будаўніцтва.

Сьпевакі капіталістычнай рэстаўрацыі Беларусі, ідэолёгі рэштак буржуазных элемэнтаў у нашай краіне,—контррэвалюцыйныя нацыянал-дэмократы, орыентуючыся на заходнюю фашысцкую „цывілізацыю і культуру“, імкнуцца сарваць генэральную лінію партыі ў нацыянальным пытаньні. Вось чаму пытаньні нацыянальна-культурнага будаўніцтва ва ўмовах Беларусі павінны быць у асяродку ўвагі практычнай работы ЛКСМБ.

Вось чаму бязьлітасная ўпартая барацьба з адхіленьнямі ад генэральнай лініі партыі ў нацыянальным пытаньні—важнейшая, вострактуальная задача ўсяго беларускага комсамолу.

Урэшце,—вось чаму ў рашэньнях ЦК УсеЛКСМ і студзеньскага пленуму ЦК КП(б)Б па пытаньнях становішча дзейнасьці ЛКСМБ, пытаньне ўдзелу ЛКСМБ у нацыянальна-культурным будаўніцтве займае адно з галоўных месц.

Падыходзячы да Х-га зьезду ЛКСМБ і IX-га зьезду УсеЛКСМ, комсамол Беларусі павінен даць чоткі і яскрава-выразны адказ, як выкананы пастаўленыя перад організацыяй задачы ў галіне нац. культ будаўніцтва—ці стаіць яна зараз у цэнтры ўвагі штодзённай практычнай дзейнасьці комсамолу.

З гэтай мэтай на старонках „Чырвонай Зьмены“ праводзіцца агляд становішча выкананьня рашэньняў ЦК УсеЛКСМ.

Сёньня мы зьмяшчаем матар'ялы, якія яскрава сьведчаць аб тым, як практычна некаторыя КСМ організацыі ажыцьцяўляюць **вузлавое пытаньне нац. політыкі партыі —задачы беларусізацыі і барацьбы з найбольш небясьпечным зараз вялікадзяржаўным шовінізмам.** Гэтыя матар'ялы сьведчаць, што работа па ўзмацненьню беларусізацыі, пытаньні рашучай барацьбы з праяўленьнямі вялікадзяржаўнага шовінізму яшчэ не занялі належнага месца і зьяўляюцца слабым зьвяном у сыстэме работы шэрагу організацый.

У буйнейшых прамысловых цэнтрах, як Менск, Віцебск, Гомель, справа беларусізацыі ў шэрагу комсамольскіх колектываў і ячэяк ажыцьцяўляецца недапушчальна марудна і часьцяком яўна ігноруецца. Паступаючыя весткі гавораць аб тым, што па шэрагу месц комсамольскія організацыі яшчэ да гэтага часу **ня ўключыліся ў праводзімы зараз месячнік беларусізацыі**, у шэрагу месц вылазкі махровага вялікадзяржаўнага шовінізму вельмі часта не сустракаюць патрэбнага руйнуючага адпору з боку комсамольскага кіраўніцтва і комсамольцаў у прыватнасьці. Усё гэта сьведчыць аб тым, што КСМ організацыя Беларусі далёка не ў выстарчальнай меры выканала рашэньні ЦК УсеЛКСМ і студзеньскага пленуму ЦК КП(б)Б аб удзеле КСМ у нацыянальна-культурным будаўніцтве, узмацненьні тэмпаў беларусізацыі, і падыходзіць да Х зьезду ЛКСМБ з наяўнасьцю прарываў у рабоце комсамолу ў гэтай галіне.

Праводзімы месячнік беларусізацыі павінен зьявіцца пераломным момантам у справе карэннага палепшаньня работы па ўдзелу ў нацкультбудаўніцтве наогул і пасіленьні тэмпаў беларусізацыі асабліва. Неабходна нанесьці руйнуючы ўдар па вылазках вялікадзяржаўнага шовінізму, як галоўнай небясьпекі, па беларускім контррэволюцыйным нацыянал-дэмократызьме, не паслабляючы барацьбы з антысэмітызмам і шовінізмамі розных колераў.

Максымальна выкарыстаць час, які застаўся да зьезду, для ўзмацненьня работы ЛКСМБ у справе выкананьня рашэньняў ЦК УсеЛКСМ, ЦК КП(б)Б па ўдзелу ў нацкультбудаўніцтве, рашуча ўзмацніць штодзённую работу ўпартага будаўніцтва нацыянальнай па форме і соцыялістычнай па зьмесце культуры.

Хопіць урачыстых абяцаньняў

Віцебск—буйны пролетарскі цэнтр Беларусі. Інтэрнацыянальная-ж работа на прадпрыемствах пастаўлена дрэнна. Асабліва дрэнна праводзіцца беларусізацыя. Месячнік беларусізацыі які праходзіць у сучасны момант, з усёй яскравасьцю паказаў, што партыйныя, савецкія і профэсыйныя організацыі пытаньням нацполітыкі партыі не ўдзяляюць даволі ўвагі.

На чыгуначным вузьле, дзе налічваецца да 5000 рабочых, беларусізацыя ў загоне. Партыйцы і комсамольцы цягнуцца ў хвасьце. З 800 членаў партыі і комсамольцаў добра ведаюць беларускую мову толькі 7-10 чалавек.

На вузьле няма ніводнага гуртка па вывучэньню беларускай мовы.

Чыгуначны клюб „Суботнік“ не прыстасаваў сваю работу да абслугоўваньня рабочых розных нацыянальнасьцяй (палякаў, яўрэяў і інш. . У бібліотэцы на 1285 рабочых беларусаў усяго толькі тры газэты на беларускай мове. Часопісаў на расійскай мове выпісваецца каля 40, а на беларускай і нацыянальных мовах-ніводнага.

Аналёгічнае становішча і ў другіх бібліотэках гораду (клюб „Парыская Комуна“ і „Профінтэрн“). Склад друкаваных выданьняў вядзе не да беларусізацыі, не да правільнага вырашэньня пытаньня адносна нацыянальных меншасьцяй, а да русіфікацыі, да праяў вялікадзяржаўнага шовінізму. Ня ўсюды яшчэ праведзена ачыстка бібліотэк ад непатрэбнай грамазды ад шкоднай рабочаму чытачу літаратуры.

Дырэктыва ўраду аб пераводзе ўстаноў і прадпрыемстваў на беларускую мову некаторымі кіраўнікамі ня выконваецца. У праўленьні ЦРК беларусізацыя заключаецца ў тым, што машыністкі перакладаюць паперкі з расійскай на беларускую мову,—а ў друкарні „Комінтэрн“ у перакладзе—бухгальтэрыі (цыфр) на беларускую мову. І партячэйка і групком друкароў пытаньнем беларусізацыі мала цікавяцца. Рашэньні сходаў да гэтага часу застаюцца толькі на паперы.

Зараз у Віцебску працуе БДТ—1. Вакол яго дзейнасьці ня створана грамадзкай думкі. Некаторыя фабзаўмесцкомы адмаўляюцца ад мэтавых закупак спэктакляў: „мы беларускай мовы не разумеем“. І гэтак гавораць цяпер, калі тэатр поўнасьцю перайшоў на востра актуальны рэпэртуар, калі ён імкнецца стаць сапраўдным агітатарам за ленінскую нацполітыку, накіраваную на разьвіцьцё культуры, нацыянальнай па форме і пролетарскай па зьместу. Кіно тэатры гораду і цырк яшчэ ня выконваюць дадзеных задач.

Значныя дасягненьні ў правядзеньні нацыянальнай політыкі мае газэта „Віцебскі Пролетары“. Іншы малюнак даюць шматтыражкі, якіх налічваецца больш дзесятку. Калі ў газэтах „Мэ промавец“ і „Молат“ хоць частка матар'ялу друкуецца на беларускай мове, дык „Лекертавец“ „Церабкоопавец“, „Красная очковница“ і „Чулочніца“ выдаюцца на расійскай мове. Для прыгожасьці на беларускай мове пішуцца толькі шапкі (і то з памылкамі)... Мала матар'ялу ў фабрычна-заводзкіх газэтах на яўрэйскай мове. Адна газэта „Шэр унд айзн“ (швэйная фабрыка) не спраўляецца з ускладзенымі на яе абавязкамі ў гэтых адносінах.

Яшчэ цэлы шэраг фактаў сьведчыць аб наяўнасьці недаацэнкі партыйнымі, профэсыйнымі, комсамольскімі і савецкімі організацыямі Віцебску настолькі важнага пытаньня, як нацполітыка, але і гэтых даволі, каб паставіць пытаньне перад адпаведнымі організацыямі аб прыцягненьні да адказнасьці асоб, якія ігноруюць дырэктывы партыі аб правядзеньні беларусізацыі. „Месячнік беларусізацыі“ павінен ускалапуць усю грамадзкасьць. Утвораны гарадзкі штаб павінен запрацаваць па-баявому.

Хопіць урачыстых абяцаньняў. Даёш справу.

Бер. Пяркоўскі.

ВІЦЕБСКІЯ РАЙКОМАЎЦЫ:—І чаго яны турбуюцца. Газэты—шматтыражкі ў нас друкуюцца па-расійску;—з 5000 рабочых і служачых беларускай мовай уладаюць 7—10 чал.—беларусізацыя наогул ня ў пашане.

Здаецца не дрэнна!?

Біць па сабатажы ў беларусізацыі

На агульных сходах і нарадах Магілеўскай швэйнай фабрыкі гавораць на расійскай мове. Пратаколы пішуцца таксама на расійскай мове і толькі часам перадрукоўваюцца на беларускую. Вучні школы ня поўнасьцю ахвачаны белмовай. Работа нацменшасьцяй пастаўлена дрэнна, ніякіх крокаў да прасоўваньня яўрэйскай літаратуры не прымаюць. У чытальні ўсяго 2 экзэмпляры „Эмэс“ і „Акцыёр“. Зусім слаба праводзіцца праца па інтэрнацыянальнаму выхаваньню. Бываюць выпадкі нездаровых узаемаадносін паміж рабочымі розных нацыянальнасьцяй.

Яўрэй—рабочы нашае фабрыкі абазваў расійца „гоем“, а руская работніца выказалася, што „у нас яўрэйская ўлада“. Некаторыя беларусы ў прыватнай гутарцы з рабочымі стараюцца гаварыць на расійскай мове.

Перад партыйнымі, комсамольскімі, фабрычнымі організацыямі павінна паўстаць задача—пасіліць правядзеньне ў жыцьцё партыйнай дырэктывы аб беларусізацыі.

Гарэлаў.

Профсаюзы ў баку

(Любаньшчына)

РК КП(б)Б і РК КСМ распачалі падрыхтоўчую працу да правядзеньня месячніку беларусізацыі, але профсаюзы ў гэтым напрамку нічога не зрабілі. Многія члены саюзу не ўладаюць белмовай. Наставнік-групорг т. Фрыдбэрг—піша адносіны на расійскай мове. Аднойчы, калі яму на гэта заўважылі, ён сказаў: „мировая революция не пострадает“. У бібліотэцы пераважае літаратура на расійскай мове, з пасярод яе ёсьць шмат такое, якую даўно пара здаць у архіў. У час правядзеньня месячніку беларусізацыі трэба мобілізаваць працоўную грамадзкасьць на рашучую барацьбу за ленінскую нацполітыку партыі.

Кох.

„Беларусізацыя—ня наша справа“

Справа беларусізацыі краіны мала цікавіць курсантаў падрыхтоўчых курсаў Марына-Горскага тэхнікуму.

Калі выкладчыкі прапануюць курсанту Малахаву здаваць лекцыі на беларускай мове, дык ён кажа: „Я ня буду гаварыць на гэтай мужыцкай, хамскай мове“.

Малахаў абзывае курсантаў—„мужыча-хамскімі рыламі“.

Ня месца ў пролетарскіх шэрагах вучнёўства сапраўды „вялікадзяржаўным хамам“.

Для іх „яшчэ рана“

Бюро Петрыкаўскага РК КСМ заслухаўшы на сваім пасяджэньні пытаньне аб становішчы беларусізацыі ў ячэйках, парашылі—прапанаваць усім ячэйкам перавесьці сваю працу на белмову.

І... больш нічога.

Калі адзін з членаў бюро прапанаваў было зрабіць праверку беларусізацыі сярод актыву, яму адказалі, што яшчэ рана (!?) і прапанова была аднагалосна адхілена. Сваёй пастановай РК змазаў важнасьць беларусізацыі і задачы КСМ у пытаньнях нацполітыкі партыі.

Дубовы.

Здымаць з працы

Загадчык Камаровіцкага паштовага агэнцтва Камоцкі думае, што пастановы партыі і ўраду аб беларусізацыі яго не датычаць. Калі тэлеграма перадаецца на белмове, дык ён так перакладзе яе на расійскую мову, што зусім губляецца сэнс. Ані слова беларускага ад яго не пачуеш.

Ёсьць яшчэ і ў саўгасе падобны экзэмпляр — бухгальтар Калодны. Той дык „баіцца“ белмовы. Калі даецца яму для подпісу адносіна на белмове, дык ён, ня чытаючы яе, падпісвае.

Пара вам, даражэнькія, узяцца за выкананьне дырэктыў партыі.

А. Рэзкі.

Беларусізацыя ў загоне

Воўчкаўскія профкурсы саюзу сельгаслесрабочых па падрыхтоўцы старшынь рабачкомаў (Самахваловіцкі раён) працуюць на расійскай мове. На сходах, гуртках і нарадах таксама не пачуеш беларускага слова.

Курсанты лічаць „ніжэй свайго гонару“ гаварыць па-беларуску. **Ч.**

Замест фэльетона

Што гэтае такое— мастацкі тэхнікум?

—... Дзе мне знайсьці мастацкі тэхнікум?

У даведачнай выпучылі вочы:

— Што вы гаворыце? Што?

Паўтараю:

— Мастацкі тэхнікум...

— А што гэтае такое? — пытае зьдзіўлёна той.

— Художественный техникум... — кажу я, успомніўшы артыкулы „Чырвонай Зьмены“ аб тым, што ў Віцебску па беларусізацыі абмежаваліся тым, што пісалі шыльды на беларускай мове.

— Так-бы вы і сказалі...

* * *

Габінэт сэкратара Віцебскага Гаркому комсамолу. Сэкратар тав. **Гладуш** звоніць па тэлефону:

— Калі ласка, дайце мастацкі тэхнікум.

— Што? Што? чуецца зьдзіўлены галасок паненскі.

— Мас-тац-кі тэх-ні-кум... расьцягвае Гладуш.

— А што гэта такое? Што гэта за мастацкі?—зноў пытае голас паненкі.

— Ды дайце ж, нарэшце, Художественный техникум.

— А-з-а! Так-бы вы адразу і казалі...

— Вось-жа, гады, беларусізуюцца.. —кідае **Гладуш** кудысьці ў куток сэкратарскага пакою.

З трэцім, не апошнім, фактам прышлося сустрэцца на 2-й Гарконфэрэнцыі комсамолу Віцебску. Адна актывістка, (нажаль, забыўся яе прозвішча) выступаючы на конфэрэнцыі гаварыла (як амаль і ўсе) па-расійску. Калі ёй напомнілі, што яна можа і што трэба гаварыць па беларуску, яна адказала:

— Таварыш, я разумею і магу гутарыць па-беларуску, але калі я зараз буду гаварыць па-беларуску дык мне прыдзецца гаварыць ня пяць хвілін, як дазваляе рэглямант, а паўгадзіны. А таму я буду гаварыць па-расійску.

У Віцебску гэткіх фактаў занадта багата. Але комсамол не змагаецца з імі.

У Віцебску мы мелі шмат вылазак антысэмітаў і шовіністых розных колераў, якім комсамольская організацыя Віцебшчыны не дала руйнуючага адпору.

Гарком комсамолу ня выкарыстаў выяўленыя конкрэтныя факты шовіністычных вылазак для мобілізацыі комсамольскай організацыі на большую барацьбу за ленінскую нацыянальную політыку.

Раённая конфэрэнцыя недастаткова застанаўлівалася на гэтым пытаньні.

Пачаўся месячнік беларусізацыі. Трэба рашуча ўдарыць па вялікадзяржаўных шовіністых, якія ня выконваюць дырэктывы партыі, гэтую непрымірымасьць перанесьці ў практыку барацьбы за ажыцьцяўленьне задач беларусізацыі.

Цішка Верны.

Ігноруюць беларусізацыю

На заводзе „Энэргія“ зусім дрэнна праводзіцца беларусізацыя. Комсамольскія ячэйкі гэтага заводу яшчэ не павярнуліся тварам да выкананьня дырэктыў партыі і ўраду па гэтаму пытаньню.

Комсамольцы ў штодзённым жыцьці беларускай мовы ня ўжываюць. На сходзе КСМ актыву, які адбыўся 23 лістапада, з 12 прамоўцаў 10 выказаліся на расійскай мове. Ёсьць нават факты ігнараваньня беларускай мовы. На сходзе распаўсюджвалі было газэту „За абарону“, адзін з комсамольцаў запытаўся: „Белорусская“, яму адказалі „беларуская“. „Ну, тогда не буду подписываться“.

Яшчэ цэлы шэраг фактаў, апрача паданых, гаворыць аб тым, што комсамольскія ячэйкі ня выконваюць дырэктыў партыі і ўраду аб беларусізацыі. За такія нядбайныя адносіны да гэтай важнейшай справы трэба вінавайцаў прыцягнуць да суровай адказнасьці.

Канончык.

На штурм фінансавага прарыву

Да X зьезду ЛКСМБ ліквідаваць прарыў

Шэраг комсамольскіх організацый прыступіў да рэалізацыі пастановы ЦК ЛКСМБ аб ліквідацыі прарыву ў выкананьні фінпляну. Менская гарадзкая ашчадкаса ўступіла ў соцспаборніцтва з Віцебскай ашчадкасай, абраўшы „Чырвоную Зьмену" арбітрам

Мэтадамі соцспаборніцтва разгортвайце барацьбу за ліквідацыю фінансавага прарыву

Мы абавязуемся!

Комсамольцы Менскай гарадзкой ашчадкасы ўступілі ў соцспаборніцтва з Віцебскай ашчадкасай

Арбітар—„Чырвоная Зьмена" і „Віцебскі Пролетары".

Улічваючы надзвычайную важнасьць выкананьня фінпляну ашчадкас, колектыў менскай гарадзкой ашчадкасы, паставіўшы сваёй матай організаваць увесь колектыў на тое, каб выканаць заданьне па мобілізацыі сродкаў, уступае ў соц. спаборніцтва з віцебскай гарадзкой ашчадкасай.

У парадку соц. спаборніцтва колектыў менскай гарадзкой ашчадкасы

абавязваецца:

Забясьпечыць выкананьне заданьня па ашчадсправе і іншых галінах працы, дзеля чаго давесьці кантрольныя заданьні па ўкладах да кожнага прадпрыемства і ўстановы, дабіцца каб гэтыя заданьні былі абгавораны на агульных сходах рабочых і організаваны сустрэчныя пляны. На кожным прадпрыемстве, разам з прыняцьцем заданьня, абгаварыць і конкрэтныя мерапрыемствы па выкананьню яго.

Ажыцьцяўленьне гэтых мерапрыемстваў павінна прайсьці пры непасрэдным удзеле прымацаваных да кожнага прадпрыемства і установы работнікаў ашчаднага апарату.

Правесьці па замацаваных за ашчадкасай колектывах кампанію дадатковай падпіскі на пазыку „Пяцігодка—у чатыры гады", забясьпечыўшы поўнае выкананьне заданьня, як асноўнага, так і дадатковага. Забясьпечыць поўнае і сваечасовае паступленьне чарговых узносаў па пазыцы „Пяцігодка ў чатыры гады" і вэлёабавязацельствах. Скончыць у хутчэйшы тэрмін рэалізацыю швэйных машын, правёўшы яе ў першую чаргу сярод буйных рабочых колектываў.

Прыняць актыўны ўдзел у правядзеньні растлумачальнай працы па безнаяўных разьліках для масавых плацяжоў насельніцтва, ахапіўшы да 1 студзеня дакладамі і гутаркамі ўсе прадпрыемствы і ўстановы. Дабіцца, каб на кожнае прадпрыемства, у кожную ўстанову былі вылучаны актывістыя для інструктажу рабочых аб парадку карыстаньня безнаяўнымі разьлікамі і запаўненьня жыравагадаў. Увесьці практычна безнаяўныя разьлікі па масавых плацяжох, дабіваючыся перавыкананьня ўстаноўленага кантрольнага заданьня.

З мэтай накапленьня вопыту вылучыць адно буйное прадпрыемства, на якім сконцэнтраваць асаблівую ўвагу для прыкладнай пастаноўкі работы, як па безнаяўных разьліках, так і па іншых галінах работы. За кошт разьвіцьця безнаяўных разьлікаў і іншых мерапрыемстваў організацыйна-агітацыйнага парадку дабіцца актывізацыі нярухомых і дробных рахункаў, працоўных укладчыкаў, зьнізіўшы іх удзельную вагу ў агульнай колькасьці ўкладчыкаў да 1 лютага 1931 году на 15 проц.

Скончыць абмен масавых пазык на пазыку „Пяцігодка—у чатыры гады" не пазьней 1-га студзеня 1931 году, забясьпечыўшы правядзеньне гэтай працы і добраякаснае абслугоўваньне дзяржальнікаў пазык. Дабіцца зьніжэньня саб-кошту опэрацый на 15 проц., супроць кошту аднэй опэрацыі па норме.

Для выкананьня дагавору і найлепшага ажыцьцяўленьня задач, якія стаяць перад ашчадкасамі, організаваць гурток па павышэньню кваліфікацыі і грамадзкай падрыхтоўкі работнікаў, ахапіўшы гуртком усіх сяброў колектыву.

Тэрмін дзейнічаньня дагавору—канец асобага кварталу і першы квартал 31 году. Праверка выкананьня дагавору ўтвараецца штомесячна на падставе ўзаемнай інформацыі колектываў менскай і віцебскай гарадзкіх ашчадкас.

— Арбітрам абраць рэдакцыі газэт „Чырвоная Зьмена" і „Віцебскі Пролетары".

Дагавор зацьверджаны на агульным сходзе працаўнікоў ашчадкас гор. Менску 30 лістапада 1930 г.

По даручэньню сходу працаўнікоў ашчадкас гор. Менску—

Жукаборскі і Шымшалевіч.

30 комсамольцаў—на фінансавы фронт

Слуцкі РК КСМ прыступіў да выкананьня пастановы ЦК ЛКСМБ аб мобілізацыі сродкаў насельніцтва. Па ячэйках профшкол і тэхнікуму вылучана 30 комсамольцаў, з якімі праведзена нарада. Усе гэтыя 30 таварышоў выяжджаюць у вёскі для правядзеньня працы па мобілізацыі ўнутраных рэсурсаў насельніцтва.

Комсамольцы абавязаліся ўцягнуць у ашчадкасы як мага больш працоўных, дабіцца поўнага спагнаньня абавязковых плацяжоў, як падатак, страхоўка, самаабкладаньне і г. д.

Комсамольцы абвясьцілі соц. спаборніцтва між сабою на лепшае правядзеньне гэтай працы.

Я. Прыбытак.

З лістоў юнкораў

Шарэнга бязьдзейнікаў і лежабокаў

* Лінская ячэйка ЛКСМБ Наравіцкага раёну апынулася ў палоне бязьдзейнасьці.

РК не зьвяртае ўвагі на гэтую ячэйку.

Сярдз.

* Комсамольская ячэйка мястэчка Дукоры, Сьмілавіцкага раёну, адмаўляецца дапамагаць хатце-чытальні.

Сэкратар ячэйкі гаворыць, што комсамольцы заняты больш важнай працай, таму яны не дапамагаюць хатце-чытальні. Што і гаварыць—„барацьбіты" за культуру!

Цімох Лявіцкі.

* Сорак комсамольцаў Шарыскай ячэйкі (Горацкі р-н) мучацца ў бязьдзейнасьці, у якой яны апынуліся дзякуючы таму, што сэкратар Галавачоў ня хоча працаваць.

Калаціла.

* Арэхаўская ячэйка ЛКСМБ (Ветрынскі раён) лічыцца толькі на паперы. Ніякай працы яна не праводзіць.

П. Вясёлы.

* Комсамольская ячэйка савгасу Блонь (Пухавіцкі раён) ніякай працы не праводзіць. Уся праца ячэйкі выявілася ў тым, што абралі бюро, якое не працуе.

Іван.

* Дысцыпліна комсамольцаў Хутарскай ячэйкі (Чэрвеньскі раён) да таго аслабла, што нават сход склікаць нельга. Бюро нічога ня робіць, каб наладзіць дысцыпліну.

Хутарскі.

* Комсамольская ячэйка в. Навасёлкі, Капаткевіцкага раёну сьпіць бесклапотным сном, запамятаўшы аб працы.

Зоркі.

* Надзвычайна дрэнна стаіць справа з політвучобай у Багушэўскім раёне. Ячэйкі не ўдзяляюць увагі гэтаму важнейшаму вучастку працы.

Акунёў.

* Сэкратар комсамольскай ячэйкі Тураўскай сельска-гаспадарчай досьледчай станцыі ня ведае колькі ў ячэйцы комсамольцаў. Пляну работы бюро ня мае. А таму ня дзіва, што работа ячэйкі кульгае.

Гаваркоў.

* Комсамольцам колгасу „Сьвярдлова" Быхаўскага раёну, ужо абрыдла хадзіць бяз працы. Шмат гавары і комсамольцы, што пара ўжо прабудзіцца ад бязьдзейнасьці, але да гэтага часу працы ў ячэйцы няма.

Майсейка.

* Плешчаніцкі колектыў комсамолу спачывае на лаўрах, спадзяючыся, што за яго будзе хто-небудзь іншы працаваць.

Сэкратар колектыву Вашкевіч часта езьдзіць у Менск, а праца не чакае, патрабуе кіраўніцтва.

Чачотка.

* Хальчанская ячэйка ЛКСМБ, Ветkаўскага раёну, бязьдзейнічае. Райком ведае аб гэтым, але ня прымае захадаў, каб ажывіць працу.

Хваля.

* Дрэнна стаіць справа з працай Самацелеўскай сельскай ячэйкі Касьцюковіцкага раёну. Сэкратар ячэйкі Казлоў не працуе.

Дырэктывы РК і агульных комсамольскіх сходаў бюро ячэйка ня выконвае.

Райкому ўжо пара зацікавіцца працай гэтай ячэйкі.

Комсамольцы.

Даць ільназагатоўкам баявыя тэмпы

Шэраг ільназагатоўчых і комсамольскіх організацый у працы па ільназагатоўках праявілі правую практыку

Па-ўдарнаму правесьці абвешчаны ЦК ЛКСМБ з 10-га сьнежня дзесяцідзёньнік,—выканаць і перавыканаць плян ільназагатовак

З 10-га па 20-е сьнежня ўдарны дзесяцідзёньнік выкананьня пляна ў ільназагатовак

ПАСТАНОВА ЦК ЛКСМБ

аб ходзе выкананьня загатовак ільна і пянькі па БССР і аб удзеле ЛКСМБ

Вызначаныя пляны загатовак па БССР знаходзяцца ў пагражаючым становішчы. На 20-га лістапада гадовы плян загатовак ільнавалакна выканачы на 1,7 проц., нарыхтавана 2 780 цэнтнэраў; і ільнянага насеньня—на 29,9 проц. Зусім нездавальняюча ідуць загатоўкі канапель, плянавае заданьне выканана ўсяго на 0,9 проц., насеньня—на 17,2. Прычыны ганебнага адставаньня ў загатоўках тлумачыцца опортуністычнай бязьдзейнасьцю шэрагу я загатоўчых, так і комсамольскіх організацый.

Выходзячы з гэтага, ЦК ЛКСМБ, для большай мобілізацыі ўсёй організацыі ЛКСМБ і б-п працоўнай моладзі на выкананьне загатовак тэх. культур, пастанаўляе абвясьціць з 10-XII па 20-XII ударны 10-ці днёвік ільназагатовак.

Задача двухтыднёвіка:—разгарнуўшы баявыя тэмпы работы вакол загатовак ільна, пянькі і канапlянага насеньня, дабіцца рашучага пералому ў загатоўках гэтых культур з тым, каб у самы бліжэйшы час поўнасьцю выканаць плянавае заданьне.

У час 10-ці днёвіка прапанаваць усім організацыям зрабіць наступнае:

1) Ячэйкам ЛКСМБ праверыць наколькі плянавыя заданьні даведзены да вёсак, колгасаў, савгасаў і асабліва да кулацка-заможных гаспадарак. Прыняць адпаведныя меры да найхутчэйшага спагнаньня з кулацка-заможных гаспадарак плянавых заданьняў не пазьней як 10-XII—30 г.

2) Правесьці шырокую растлумачальную кампанію сярод колгасьнікаў і аднаасобных бядняцка-серадняцкіх мас за найхутчэйшую і лепшую апрацоўку ільна і здачы яго дзяржаве ў добраякасным выглядзе, організуючы спэцыяльныя брыгады з комсамольцаў з прыцягненьнем б-п бядняцка-серадняцкай моладзі на дапамогу ў выкананьні вытворчых патрэб за рацыянальную і поўную нагрузку ільнамялак і прымяненьне іншых мерапрыемстваў, якія-б садзейнічалі найхутчэйшаму выкананьню заданьня.

3) Праверыць выкананьне па кантракцыі і прыняць адпаведныя меры для тэрміновага спагнаньня.

4) Узяць на сябе ініцыятыву у організацыі сустрэчных пляна ў загатовак, шляхам наладжваньня чырвоных абозаў па датэрміновай здачы дзяржаве лішкаў ільна і насеньня, разгарнуўшы соц. спаборніцтва паміж паасобнымі вёскамі, савгасамі і колгасамі, а таксама загатоўчымі пунктамі і паасобнымі загатоўцамі.

5) Праверыць працу камісій садзейнічаньня загатоўкам пры с-савеце і дабіцца ажыўленьня іх працы, прымацаваўшы комсамольцаў для шырокай дапамогі ў іх працы па выкананьню пляна ў.

6) Групам ЛК праверыць ці правільна разьмяркоўваюцца вызначаныя для прэміяваньня здатчыкаў фонды і ў якім стане яны знаходзяцца.

7) Прыняць адпаведныя меры каб склады і базы сваечасова здавалі тэхкультуры для прамысловасьці.

8) Ячэйкам ЛКСМБ праверыць ці падрыхтаваны адпаведныя памяшканьні для захаваньня насеньня ільна і канапель, ці створаны брыгады садзейнічаньня па ахове ад пажараў і інш. шкодніцтваў.

9) Аб выкананьні інформаваць ЦК ЛКСМБ.

Яўрэйскі ТРАМ абвяшчае набор у сымфонічны оркестр пад кіраўніцтвам тав. Гітліца. Жадаючыя працаваць у оркестры (не залежна ад таго ці маюць інструманты) павінны падаць заяву па адрасу: Няміга - Ракаўская, 9, Яўпэдтэхнікум, праўленьню ТРАМ'у. Заявы прымаюцца ад 7-ай да 10-ай гадзіны ўвечары

У оркестр прымаюцца таксама і гарманістыя.

Праўленьне ТРАМ'у.

Згодна пастановы бюро ФРК ЛКСМБ, вечар рабочай «сьмякалкі" пераносіцца з 10 на 20 сьнежня 1930 г.

Сёньня, 9-га сьнежня, а 6-ай гадзіне адбудзецца нарада культпропаў колектываў і ячэек ЛКСМБ Фрунзэўскага раёну.

Нам пішуць

Ячэйкі ЛКСМБ ня ўдзейнічаюць у ільназагатоўках

Комсамольская ячэйка Вертм... скага сельсавету (Сьмілавіцкі р...) не дапамагае ў працы колгасу „Добрая Воля". З-за нястачы рабочых рук колгас ня выканаў заданьня па здачы ільнавалакна і ільнанасеньня, а комсамольская ячэйка палец аб палец ня ўдарыла, каб організаваўшы сілы комсамольцаў і працоўнай моладзі, дапамагчы колгасу сваечасова выканаць плян ільназагатовак.

У колгасе засталася яшчэ на полі значная колькасьць ільну, а комсамольская ячэйка не падбала аб тым, каб дапамагчы колгасу ўбраць лён.

Б.

***

Комсамольская ячэйка Пат... нянскага сельсавету (Межынскі р...) зусім ня прымае ніякага ўдзелу ў правядзеньні работы па ільназагатоўках. Плян ільназагатовак не даведзен да вёсак і колгасаў. ... асобныя колгасы, у сьвязку з нехваткай рабочых рук, не змаглі сваечасова апрацаваць лён для здачы.

Комсамольская ячэйка не паклапацілася дапамагчы колгасу паскорыць працу па апрацоўцы ільну.

Некаторыя комсамольцы былі зусім ня выходзяць на працу, чым зрываюць работу колгасу па апрацоўцы ільну.

Бюро ячэйкі і райкому комсамолу неабходна прыняць рашучыя меры в тым, каб узмацніць удзел ячэйкі і комсамольцаў у ільназагатоўках і дапамагчы колгасам сваечасова выканаць плян здачы ільну.

М. Бяседа.

Да X-га зьезду ліквідаваць прарыў

Бюро РК КСМ Лёзьненскага раёну заслухала пытаньне аб мобілізацыі ўнутраных сродкаў насельніцтва. На паседжаньні высьветлілася, што па раёне гэтая праца знаходзіцца ў поўным заняпадзе. З 13 сельсаветаў яшчэ ні адзін ня справіўся на 100 проц. з гэтай задачай.

Па ўсіх сельсаветах назіраецца пратэрміноўка крэдытаў на вялікія сумы, не аформлена пазыка „Пяцігодка—у чатыры гады", ня выканана страхоўка пляна ў самаабкладаньня, пратэрмінаваны падаткі і гэтак далей.

У некаторых сельсаветах (Лёзьнясельскі, Сутоцкі, Гладонскі і інш.) гадовы плян па мобілізацыі сродкаў выканан толькі на 20-40 проц.

Большасьць комсамольскіх ячэек пытаньнем мобілізацыі сродкаў насельніцтва зусім не займалася і не займаецца.

Бюро РК у сваёй пастанове адзначыла:—„У падарунак X зьезду ЛКСМБ комсамольскія ячэйкі павінны выканаць гадовае заданьне па мобілізацыі сродкаў насельніцтва. Неабходна гэтую працу ўвязваць з усёй працай сельсаветаў".

Комсамольская організацыя Лёзьненшчыны павінна ўзяцца за ліквідацыю фінансавага прарыву і выкананьне пастаноў партыі і ўраду ў гэтай галіне. Гэта будзе лепшым рапартам X зьезду ЛКСМБ.

К. Кароль.

АДКАЗНЫ РЭДАКТАР—
РЭДКОЛЕГІЯ

Друкарня імя тав. Сталіна

Галоўлітбел № 599